# Рэклама

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе» ад 10.05.2007 № 225-З, рэклама – гэта інфармацыя аб аб'екце рэкламавання, якая распаўсюджваецца ў любой форме з дапамогай любых сродкаў, накіраваная на прыцягненне ўвагі да аб'екта рэкламавання, фарміраванне або падтрыманне цікавасці да яго і (або) яго прасоўванне на рынку. Размяшчэнне рэкламы магчыма як на стацыянарных аб'ектах (будынках, збудаваннях) у выглядзе шыльдаў, інфармацыйных таблічак, надкрышных і насценных рэкламных канструкцый, плакатніц, расцяжак так і на іншых тэхнічных сродках: рэкламных шчытах, рэкламных паказальніках, лайтпостерах, наземных пано і інш.

**Размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламараспаўсюджвальнікам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у т.ч.на тэрыторыі Гомельскага раёна, рэкламы, якая падлягае ўзгадненню з упаўнаважаным дзяржаўным органам (райвыканкамам), без такога ўзгаднення, не дапускаецца.**

Райвыканкамам у рамках заканадаўства ажыццяўляе адміністрацыйныя працэдуры па прыёме заяў, афармленні, узгадненні і сцвярджэнні пашпартоў вонкавай рэкламы, афармлення дагавораў на прадастаўленне ў карыстанне прасторы Гомельскага раёна ў рэкламных мэтах і іншыя.

Разам з тым, нагадваем, што **парушэнне рэкламадаўцам, рэкламавытворцам, рэкламараспаўсюджвальнікам заканадаўства аб рэкламе цягне накладанне штрафу ў памеры ад 5 да 30 базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка – ад 10 да 40 базавых велічынь, а на юрыдычную асобу – ад 20 да 50 базавых велічынь** (арт. 12.15 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях) ".

Па ўсіх пытаннях размяшчэння рэкламы на тэрыторыі Гомельскага раёна варта звяртацца ў аддзел эканомікі райвыканкама: г. Гомель, вул. Ільіча, 51 А (каб. 315). Кантактны тэлефон: 8-

(0232) 53-79-26.

**Нарматыўна-прававыя акты**